# КІРАЎНІК ДЗЯРЖАВЫ ПАТРАБУЕ АКТЫЎНАСЦІ І АДКАЗНАСЦІ

**31 жніўня Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнка прыняў са справаздачай прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь С.С.Лінга.**

Як паведаміла прэс-служба прэзідэнта, кіраўнік урада далажыў аб выніках пасяджэння Прэзідыума Савета Міністраў, што адбылося 24 жніўня. С.С.Лінг інфармаваў аб асноўных напрамках, па якіх урад вядзе работу. Гэта ў першую чаргу праблемы, звязаныя з энерганосьбітамі, пастаўкамі нафты, вугалю, выкарыстаннем мясцовых рэсурсаў, пытанні эканоміі рэсурсаў, разлікі прадпрыемстваў за энерганосьбіты. Кіраўнік урада заявіў, што ў бліжэйшы час плануецца правесці спецыяльнае пасяджэнне Прэзідыума Савета Міністраў, на якім будзе разгледжана пытанне аб адказнасці за нявыплату за энерганосьбіты. Прэзідэнт падтрымаў урад у пытаннях строгай адказнасці за эканомію і разлікі за энерганосьбіты.

Прэзідэнт выказаў заклапочанасць сітуацыяй па назапашванню харчовых і эксплуатацыйных запасаў і даручыў ураду прыняць усе меры па набыццю і выпрацоўцы неабходнай колькасці паліўнага мазуту. Адначасова кіраўнік дзяржавы падкрэсліў адказнасць выканкамаў у пытанні завозу вугалю, мясцовых рэсурсаў насельніцтву.

Прэм'ер-міністр у сваю чаргу падкрэсліў, што насельніцтва краіны будзе ў поўным аб'ёме забяспечана агароднінай і бульбай, харчовым збожжам, мясам і малаком, добрыя перспектывы па маслу, а па сухому малаку, сырах і дзіцячаму харчаванню план па стварэнню запасаў перавыканананы ўжо. Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што ўраду неабходна больш актыўна праводзіць работу па закупцы фуражнага зерня, бо цэны на яго будуць павышацца.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы